УДК 373.3.035.6

***В.Р. Слівец,***
*кандыдат філалагічных навук,*
*УА "Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна"*
*Мазыр, Рэспубліка Беларусь*

# ВУЧЭБНАЕ ВЫДАННЕ "БЕЛАРУСЬ – НАША РАДЗІМА. ПАДАРУНАК ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ А. Р. ЛУКАШЭНКІ ПЕРШАКЛАСНІКУ" ЯК ТРАНСЛЯТАР НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНЫХ ІДЭЙ І КАШТОЎНАСЦЕЙ

*Анатацыя. У артыкуле разглядаюцца адукацыйны патэнцыял і выхаваўчыя магчымасці вучэбнага выдання "Беларусь – наша Радзіма. Падарунак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі першакласніку" як сродку фарміравання ў малодшых школьнікаў нацыянальна-культурных ідэй і каштоўнасцей у кантэксце полікультурнага выхавання.*

*Ключавыя словы: полікультурнае выхаванне, вучэбнае выданне, нацыянальная культура, нацыянальная самасвядомасць.*

***V.R. Slivets,***
*PhD in Philology*
*Mozyr State Pedagogical University named after I.P. Shamyakin*
*Mozyr, Republic of Belarus*

МГПУ им. И. П. Шамякина

# STUDY EDITION "BELARUS – OUR MOTHERLAND. A PRESENT FROM THE PRESIDENT OF THE REPUBLIC OF BELARUS A. R. LUKASHENKA TO A FIRST GRADER" AS A TRANSMITTER OF NATIONAL AND CULTURAL IDEAS AND VALUES

*Abstract. The article examines the educational potential and educational possibilities of study edition "Belarus – our Motherland. A present from the President of the Republic of Belarus A. R. Lukashenka to a first grader" as a means of forming national and cultural ideas and values in the context of multicultural education.*

*Keywords: multicultural education, study edition, national culture, national self-awareness.*

На сённяшні дзень ва ўсім сусветным грамадстве прасочваецца ўстойлівая цікавасць да пытанняў полікультурнага выхавання як аднаго з прыярытэтных напрамкаў сучаснай адукацыі, што непасрэдна звязана з вядучымі тэндэнцыямі развіцця агульнадзяржаўнага полікультурнага асяроддзя ва ўмовах глабалізацыі, наладжвання палітычнага, эканамічнага і культурнага супрацоўніцтва краін. Актуальнай з'яўляецца праблема стварэння полікультурнай адукацыйнай прасторы, якая б стала тым спецыяльна арганізаваным сацыяльным асяроддзем, дзе б адлюстроўваліся адметныя ўласцівасці ўсёй шматстайнасці культур, ствараліся ўмовы для іх натуральнага ўзаемадзеяння і дыялога.

Як адзначае В.У. Гукаленка (і інш. вучоныя-педагогі), перад чалавекам, калі ен аказваецца на мяжы культур, узнікаюць дзве важныя асабіста значныя праблемы: захаванне сваёй культурнай ідэнтычнасці і адаптацыя да полікультурнага асяроддзя [1, с. 190]. Так, згодна з Канцэпцыяй бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнеўскай моладзі (далей – Канцэпцыяй) [2], полікультурнае выхаванне ў Рэспубліцы Беларусь накіравана на фарміраванне талерантных адносін да прадстаўнікоў іншых культур, нацыянальнасцей, веравызнанняў і, адпаведна, грунтуецца на прынцыпах талерантнасці, павагі да іншых народаў і культур, роўнасці і суіснавання сацыяльных груп, прадстаўнікоў розных рас, рэлігій, этнасаў. І калі яшчэ на ступені дашкольнай адукацыі выхаванцы павінны атрымаць першапачатковае прадстаўленне аб разнастайнасці народаў і культур, то полікультурнае выхаванне ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі павінна забяспечыць аптымальныя ўмовы для далейшага развіцця каштоўнасных арыентацый, скіраваных на фарміраванне культуры міжнацыянальнага і міжканфесійнага ўзаемадзеяння разам са станаўленнем нацыянальнай самасвядомасці навучэнцаў. Менавіта гэты аспект полікультурнага выхавання, як і асэнсаванне сваёй этнічнай прыналежнасці, ідэнтыфікацыі, знаходзяцца ў ліку прыярытэтных пытанняў шматнацыянальных дзяржаў, у тым ліку і нашай рэспубліцы.

Адпаведна з Главой 5 Канцэпцыі, полікультурнае выхаванне на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі арыентуецца на вывучэнне асноў культуры свайго народа, назапашванне і развіццё ведаў аб культурнай і этнічнай разнастайнасці, што, у сваю чаргу, непарыўна звязана са зместам грамадзянскага і патрыятычнага выхавання на гэтай ступені навучання, якое прадугледжвае фарміраванне першасных ведаў аб ідэалогіі беларускай дзяржавы, аб родным краі; пачуцця гонару за гісторыю свайго горада, вёскі, рэгіёна, краіны і яе знакамітых людзей.

Традыцыйна (з 2004 г.) у Дзень ведаў усе першакласнікі нашай краіны атрымліваюць падарунак ад Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь – вучэбны дапаможнік *"Беларусь – наша Радзіма"*. Пачынаецца ён са звароту А.Р. Лукашэнкі, у якім акрэсліваюцца вызначальныя для кожнага беларуса ідэі і арыенціры, што павінны стаць зыходнымі палажэннямі ў выхаванні будучых грамадзян і сапраўдных

МГПУ им. И.П. Шамякина

патрыётаў нашай краіны: *“...менавіта тут, ля парога бацькоўскага дома, і пачынаецца твая Радзіма. Наша з табой агульная і адзіная Радзіма – Рэспубліка Беларусь. Тут ты нарадзіўся, на гэтай зямлі жылі твае продкі, жывуць і працуюць твае бацькі, сваякі, суседзі – землякі, грамадзяне нашай краіны.*

*Шмат ёсць іншых краін у свеце, але толькі пад небам Бацькаўшчыны ты зможаш знайсці сваё месца, раскрыць свае здольнасці, творчай працай прынесці найбольшую карысць грамадству і адчуць сябе па-сапраўднаму шчаслівым”* [3, с. 3]. У гэтым кароткім звароце-прамове таксама робіцца акцэнт на неабходнасці фарміравання асобы дзіцяці за кошт развіцця такіх якасцей, як працавітасць, настойлівасць, добрасумленнасць, чуласць, што павінны не толькі паспрыяць правільнаму ўяўленню першакласнікаў аб дастойным грамадзяніне сваёй Айчыны, але ўвогуле зарыентаваць іх на ўсведамленне агульначалавечых гуманных каштоўнасцей, у ліку якіх, безумоўна, любоў і павага да сваёй Радзімы.

Кніга ўжо неаднаразова ўдасканальвалася і перавыдавалася. У гэтым годзе – 2022 – яна пабачыла свет у аднoўленай канцэпцыі: разам са структурай, зместам змяніліся дызайн і афармленне дапаможніка.

Ужо на першых яго старонках юнага чытача сустракаюць героі з традыцыйнымі для беларусаў імёнамі – хлопчык Алесь і дзяўчынка Алена, – якія і будуць суправаджаць чытача-першакласніка ў завочным падарожжы, прапанаваным у кнізе, у зразумелай і даступнай форме тлумачыць факты з мінулага і сучаснага жыцця беларусаў.

Кніга складаецца з наступных раздзелаў: “Мы, народ Рэспублікі Беларусь…”, “Дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь”, “Наша краіна на карце”, “Горад-герой Мінск – сталіца Рэспублікі Беларусь”, “Заўсёды ў памяці народнай”, “Вобразы мілыя роднага краю…”, “Прырода роднага краю”, “Чырвоная кніга Рэспублікі Беларусь”, “Замкі і палацы”, “Храмы Беларусі”, “Як да нас прыйшла кніга”, “Песняры беларускага народа”, “Беларускі нацыянальны касцюм”, “Беларускія рамёствы”, “Беларуская нацыянальная кухня”, “Сучасная культура Беларусі”, “Адукацыя і навука”, “Даследаванне космасу”, “Дадатковая адукацыя”, “Фізічная культура і ўмацаванне здароўя”, “Прафесіі”, “Зроблена беларусамі”, “Узнагароды Рэспублікі Беларусь”, “Нашы святы”, “Мой радавод”. Тэматыка раздзелаў дае магчымасць навучэнцам асэнсаваць асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы, прававых ведаў, развіць паважлівыя адносіны да дзяржаўных сімвалаў, органаў дзяржаўнай улады. Пры гэтым належная ўвага надаецца ўсведамленню адметнасцей нацыянальнай культуры як гістарычнай сукупнасці мастацкіх, матэрыяльных, філасофскіх, эстэтычных і інш. каштоўнасцей і дасягненняў, створаных беларусамі, раскрыццю глыбіні і ўнікальнасці нацыянальных традыцый як сацыяльнай і культурнай спадчыны, што перадаецца ад пакалення пакаленню.

У выданні 2022 года прыярытэтнымі з’яўляюцца раздзелы, прысвечаныя дасягненням сучаснай Беларусі, якія адлюстроўваюць узровень культуры, што *“ўвабрала ў сябе багатую спадчыну мінулых часоў, высокія ідэалы дабра і справядлівасці”* [3, с. 40], адукацыі і навукі, прамысловасці, сельскай гаспадаркі і іншых сацыяльна-эканамічных дасягненняў Беларусі і яе народа. Адметнае месца адведзена раздзелу “Заўсёды ў памяці народнай”, які ў сімвальнай форме паказвае подзвіг і нялёгкі шлях савецкага народа да перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, што бачыцца асабліва актуальным, бо, як вядома, 2022 год у нашай рэспубліцы праходзіць пад знакам Года гістарычнай памяці.

Выданне выгадна дапоўнена элементамі інфаграфікі, схемамі, мультымедыйнай нагляднасцю. У дапаможнік уключаны аўдыязапісы і відэаролікі, якія можна паслухаць і паглядзець, адсканіраваўшы адпаведныя QR-коды, размешчаныя на старонках. Гэта гімн Рэспублікі Беларусь, песні “Спадчына” на словы Янкі

МГПУ им. И.П. Шамякина

Купалы, "Мой родны кут", што, як і паэма "Новая зямля" Якуба Коласа, сталі знакавымі творамі для беларусаў; мультфільмы пра гербы беларускіх гарадоў – абласных цэнтраў, "Пілiпка", зняты паводле беларускай народнай казкі "Пiлiпка-сынок"; відэаролікі пра плошчу Перамогі ў сталіцы рэспублікі з цыклу "Обелиски великого подвига", пра Рэспубліканскі ландшафтны заказнік "Ельня" – найстарэйшы балотны масіў у Беларусі і адзін з найбольш рэдкіх у Еўропе. Акрамя гэтага, праз праграму "AIV – дополненная реальность" можна ўбачыць і 3D-мадэль кар'ернага самазвала "БелАЗ" (самага вялікага ў свеце), што, безумоўна, зацікавіць кожнага навучэнца.

Адукацыйны патэнцыял і выхаваўчыя магчымасці выдання настолькі вялікія, што яго могуць выкарыстоўваць не толькі настаўнікі пачатковых класаў у адукацыйным працэсе I ступені агульнай сярэдняй адукацыі пры выкладанні вучэбных прадметаў "Уводзіны ў школьнае жыццё", "Навучанне грамаце", "Беларуская мова", "Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)", "Чалавек і свет", "Выяўленчае мастацтва", "Музыка" і інш., пры правядзенні інфармацыйных і класных гадзін у 1–4 класах, але і выхавальнікі груп падоўжанага дня пры арганізацыі мерапрыемстваў на маральна-этычную, грамадзянска-патрыятычную, гісторыка-культурную тэматыку, кіраўнікі школьных музеяў, краязнаўчых гурткоў.

Падрыхтоўка падобных вучэбных выданняў і ўкараненне іх у вучэбна-выхаўваўчы працэс устаноў адукацыі, на наш погляд, дае магчымасць для стварэння цэласнай адукацыйнай прасторы, у межах якой кожны вучань можа прыйсці да ўсвядомленага ўспрымання сваёй этнакультурнай прыналежнасці, атрымаць выразнае ўяўленне аб асаблівасцях нацыянальнага менталітэта, сфарміраваць каштоўнасныя адносіны да набыткаў гісторыі і культуры свайго народа, стаць асобай, здольнай рэалізаваць сябе ў мікраасяроддзі школы, шырокім грамадстве і полікультурным узаемадзеянні.

*Спіс крыніц*

1. Гукаленко, О.В. Поликультурное образование : теория и практика / О.В. Гукаленко ; Рос. акад. образования (Юж. отд-ние) [ и др.]. – Ростов н/Д : РГПУ, 2003. – 510 с.

2. Об утверждении Концепции непрерывного воспитания детей и молодежи: постановление Министерства образования Респ. Беларусь, 15 июля 2015 г. № 82 // Сборник нормативных документов Министерства образования Республики Беларусь. – 2015. – № 19. – С. 3–41.

3. Беларусь – наша Радзіма. Падарунак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі першакласніку : вучэб. дапам. для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання (з электроннымі дадаткамі) / склад. Л.Ф. Кузняцова, В.І. Цірынава, Н.Г. Ваніна, Д.В. Аўчараў. – Мінск : "Адукацыя і выхаванне", 2022. – 64 с.

МГПУ им. И. П. Шамякина